Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# РУКАПІСЫ І ПРЫЖЫЦЦЁВЫЯ ВЫДАННІ ТВОРАЎ С. МАНЮШКІ, ІКАНАГРАФІЧНЫЯ КРЫНІЦЫ І ДАКУМЕНТЫ Ў АРХІВАХ РОЗНЫХ КРАІН

**А. П. Дзенісенка**

*Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі (Мінск, Беларусь)*

## МУЗЫЧНЫЯ ТВОРЫ СТАНІСЛАВА МАНЮШКІ І ПОЛЬСКАМОЎНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ЯГО ТВОРЧАСЦІ (ПА ФОНДАХ ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ)

У гэтым годзе споўнілася 200 гадоў ад нараджэння вялікага польска-беларускага кампазітара Станіслава Манюшкі, дырыжора XIX ст., стваральніка нацыянальных твораў у галіне сімфанічнай музыкі, аднаго з заснавальнікаў нацыянальнага камерна-вакальнага жанру.

Тую ролю, якую Станіслаў Манюшка адыграў у развіцці польскай музыкі, можна параўнаць з роллю А. Міцкевіча ў польскай паэзіі. Абодва яны змагаліся за народнасць мастацтва і патрабавалі ад яго праўдзівасці, выражэння вялікіх нацыянальна-вызваленчых ідэй, абодва звярталіся да фальклорных багаццяў беларускага народа [1, с. 120].

Фонды аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНБ НАН Беларусі) захоўваюць прыжыццёвыя выданні музычных твораў кампазітара, а таксама польскія і беларускія выданні, што распавядаюць пра жыццё Станіслава Манюшкі на Беларусі і ў Польшчы, пра яго дзейнасць у якасці кампазітара, дырыжора, педагога.

У фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца музычныя творы С. Манюшкі, якія былі надрукаваны ў Вільні ў сярэдзіне XIX ст. У віленскай друкарні Юзафа Завадскага выйшла кніга Уладзіслава Сыракомлі (Людвіка Кандратовіча) «Córa Piastów. Powieść wierszem z dziejów litewskich. Przez Władysława Syrokomlę. Z muzyką St. Moniuszki» (Wilno: Nakł. Księg. p. f. Rubena Rafałowicza, 1855). У выданні змешчаны музычны твор Станіслава Манюшкі – «Паходная песня ліцвінаў» (іл. 1). На пажоўклым ад часу аркушы мудрагеліста ўплеценая ў арнамент назва песні на словы У. Сыракомлі. «Паходная песня ліцвінаў» – гэта адзін з варыянтаў арыгінальнай старадаўняй песні, тэкст якой пераносіць нас у далёкія часы: «Весела шуміць лес, ліцвіны выступілі ў паход, спяваюць бадзёрую песню пра свае подзвігі. Заўтра будзе бой. Каб толькі коні не падвялі і стаялі смела! У добры час…»



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by




Іл. 1. Рэдкае выданне У. Сыракомлі «Дачка Пястаў» (Syrokomla, W. Córa Piastów. Powieść wierszem z dziejów litewskich przez Władysława Syrokomłe. Z muzyką St. Moniuszki. Wilno, 1855), дзе змешчаны музычны твор Станіслава Манюшкі «Паходная песня ліцвінаў»

Сярод прыжыццёвых выданняў твораў кампазітара – нотнае выданне «Lirnik wioskowy», якое выйшла ў віленскай друкарні Ю. Завадскага. Гэта вакальны цыкл С. Манюшкі «Lirnik wioskowy» на аднайменны верш У. Сыракомлі (іл. 2). На тытуле адсутнічае год выдання. Магчыма, з гэтым вершам кампазітар мог пазнаёміцца ў 1852 г., калі У. Сыракомля прыязджаў з арандаванага ім фальварка Залучча ў Вільню і спыняўся ў доме Мюлера, цесця С. Манюшкі, каб працягваць працу над тэкстам кантаты «Год у песні». Час магчымага напісання музыкі да верша «Lirnik wioskowy» польскі музыказнаўца Эрвін Навачык абмяжоўвае часам ад напісання верша (1852) да першага выканання твора (1857) [3, с. 30]. Аднак верагодна, што вакальны цыкл «Lirnik wioskowy» С. Манюшка напісаў менавіта ў 1857 г., як лічыць сучаснік кампазітара польскі музыказнаўца Ежы Ляскарыс. У сваіх нататках, змешчаных у часопісе «Teka Wileńska», ён нагадвае, што С. Манюшка ў 1857 г. шмат увагі надаваў пераробцы оперы «Галька» і, акрамя таго, напісаў яшчэ некалькі твораў, першым з якіх названы быў менавіта «Lirnik wioskowy» [10, s. 306].

Экзэмпляр «Lirnik wioskowy» вялікага памеру – 250×330 мм. На форзацы змешчаны аўтограф У. Сыракомлі і подпісы блізкіх паэту людзей, што робіць гэта выданне вельмі каштоўным. Мяркуецца, што верш быў напісаны У. Сыракомлем экспромтам падчас адной з літаратурна-музычных вечарын. На гэта ўказваюць адна папраўка ў тэксце і непасрэднасць самога зместу. Верш быў


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



Іл. 2. Ноты вакальнага цыкла С. Манюшкі «Lirnik wioskowy» на верш У. Сыракомлі

адрасаваны аднаму з прысутных на вечарыне – музыканту Фаўстыну Лапатынскаму.

Пад вершам-прысвячэннем услед за У. Сыракомлем падпісаліся Баляслаў Навінскі (акцёр Віленскага тэатра), Мікалай Акялевіч (вядомы літоўскі пісьменнік), Эміль Дэрынг (акцёр Віленскага тэатра) і інш. Калектыўны подпіс замыкае Паўліна Кандратовіч, жонка У. Сыракомлі [3, с. 36–38].

Сродкі музычнай выразнасці кампазітар чэрпаў з народнай музыкі, цесна звязанай з народнымі звычаямі і абрадамі. С. Манюшка аддаваў перавагу народным песням, таму што лічыў іх найбольш даступнымі для разумення простаму люду. Кампазітар закранаў у іх тэмы і пытанні, блізкія сэрцу сваіх сучаснікаў, сярод якіх былі не адны толькі гараджане. Песні Манюшкі прасочваліся і ў сельскія пласты насельніцтва. Напісаныя з вялікім цяплом і шчырасцю, з глыбокай сардэчнасцю, яны гучалі не ў адной вёсцы.

У віленскай тыпаграфіі Ю. Завадскага быў выдадзены нотны зборнік сялянскіх песенек Станіслава Манюшкі пад агульнай назвай «Nad Nidą» [11]. Гэта прыжыццёвае выданне кампазітара, якое выйшла прыблізна ў сярэдзіне XIX ст. (іл. 3). Зборнік вялікага памеру (270×340 мм), у яго ўвайшлі песні і балады на словы В. Вольскага, У. Сыракомлі, Я. Чачота. Музыку да ўсіх твораў зборніка напісаў С. Манюшка. У выданні змешчаны музычная балада на словы E. Sztyrmera «Magda Karczmarka», сялянскія песенькі на словы У. Сыракомлі


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by




Іл. 3. Вокладка музычнага зборніка С. Манюшкі «Nad Nidą»



Іл. 4. «Piosnki sielskie» з пятага «Śpiewnika domowego» С. Манюшкі

«Pieśń poranna», «Kłosek», «Przepióreczka», «Pieśń wójta», «Pieśń Wieczorna»; сялянскія песні на словы Я. Чачота з «Хатніх спеўнікаў»[1] (гл. іл. 4), у тым ліку нотны запіс песні «Sierota» («Сірата») для аднаго голасу ў суправаджэнні фартэпіяна, і інш.

Упершыню пасля смерці С. Манюшкі выйшлі творы кампазітара на яго радзіме. Былі сабраны і выдадзены ўсе 22 песні нашага славутага класіка на вершы Я. Чачота, якія ўвайшлі ў музычны зборнік «Песні з-над Нёмна і Дзвіны» (Мінск, 1996). Змест песень быў перакладзены з польскай на беларускую мову У. Мархелем, У. Дубоўкам, К. Цвіркам, Я. Міклашэўскім, З. Трашчкоўскай і інш. Укладальнікі – Віктар Скорабагатаў, Уладзімір Мархель, Галіна Каржанеўская. У музычны зборнік «Песні з-над Нёмна і Дзвіны» ўвайшлі песні: «Ой, бярозка міла…», «Ах, далёка...», «Што там за кветка», «Кум і кума», «Салоўка», «Казак», «Праснічка», «Гай шуміць», «Дуброва», «Зязюлька»,

[1] У першы «Хатні спеўнік» (1843) кампазітара ўвайшлі тры сялянскія песні Я. Чачота: «Ах, далёка…», «Што там за кветка…», «Ой, бярозка міла…». У другім «Хатнім спеўніку» (1845) змешчана песня «Кум і кума» на словы Я. Чачота; песні «Праснічка», «Салоўка» на вершы Я. Чачота ўвайшлі ў трэці «Хатні спеўнік» (1851) С. Манюшкі, у чацвёрты (1855) – песня «Вандроўная пташка». Больш за ўсё песень С. Манюшкі на тэксты Я. Чачота трапіла ў пяты «Хатні спеўнік» (1858) – 12 песень (іл. 4). Усяго С. Манюшка напісаў 22 песні на арыгінальныя тэксты Я. Чачота і на яго апрацоўкі-пераклады вуснапаэтычных твораў [4, с. 9].


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

«Мядзведзік», «Сірата», «Ты пастой, мая галубка…», «Прыляцелі сакалочкі», «Добра, як у пана» і інш. [2].

У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца рукапісныя нотныя запісы песень «Саколікі» і «Каля хацінкі» з музыкай С. Манюшкі. Гэтыя матэрыялы былі выяўлены сярод дакументаў рукапіснага архіва беларускай пісьменніцы Ларысы Геніюш (1910–1983), якая была збіральніцай беларускага песеннага фальклору [6].

У фондах ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца польскія і беларускія выданні, што распавядаюць пра жыццё і дзейнасць Станіслава Манюшкі. Польская музыказнаўчая літаратура налічвае шэраг манаграфій канца XIX – пачатку XX ст. У большасці сваёй у гэтых манаграфіях асвятляецца жыццёвы і творчы шлях кампазітара.

Першы біёграф С. Манюшкі – яго сучаснік і сябра Аляксандр Валіцкі – у сваёй манаграфіі падаў каштоўныя звесткі пра жыццё і творчасць класіка польскай музыкі (Walicki, A. Stanisław Moniuszko. Warszawa, 1873, nakładem autora). Даследаванне А. Валіцкага стала асновай для манаграфій іншых польскіх даследчыкаў таго часу. Так, у працы А. Палінскага (Poliński, A. Moniuszko. Kijów – Warszawa, 1914) побач з матэрыяламі, надрукаванымі ўпершыню, падаюцца факты біяграфіі кампазітара, якія былі змешчаны ў манаграфіі А. Валіцкага.

Манаграфія А. Валіцкага часткова выкарыстоўвалася і ў працы польскага даследчыка Г. Апенскага (Opieński, H. Stanisław Moniuszko. Życie I dzieła. Lwów – Poznań, 1924), які прэтэндаваў на навуковае асвятленне творчасці С. Манюшкі [5, с. 7].

Адзін з вядучых даследчыкаў творчай і эпісталярнай спадчыны С. Манюшкі – польскі кампазітар і музыказнаўца, педагог Вітальд Рудзінскі (1913–2004). Вучань Тадэвуша Шалігоўскага (1896–1963)[1] скончыў Віленскую кансерваторыю па класе кампазіцыі і фартэпіяна ў 1937 г. Працягваў сваю адукацыю ў Парыжы, быў выкладчыкам Віленскай і Лодзінскай кансерваторый. Аўтар опер «Выправа грэчаскіх паслоў» («Odprawa posłów greckich») і «Сяляне» («Chłopi») у пастаноўцы музычных тэатраў у Кракаве і Варшаве [Тамсама, с. 8]. Манаграфія В. Рудзінскага пра класіка польскай музыкі С. Манюшку з'яўляецца літаратурна-мастацкім даследаваннем жыцця і дзейнасці славутага кампазітара. Кніга была выдадзена ў Кракаве Польскім музычным выдавецтвам (1955). У фондах ЦНБ НАН Беларусі захоўваецца яе першая частка [16], але і яна змяшчае найбольш вычарпальныя звесткі і матэрыялы пра польскага кампазітара. У сваёй працы В. Рудзінскі асвятляе найбольш поўна тыя бакі

[1] Тадэвуш Шалігоўскі з 1932 г. выкладаў кампазіцыю ў Віленскай кансерваторыі імя М. Карловіча. Грунтоўную прафесійную адукацыю атрымаў у кансерваторыі Польскага музычнага таварыства ў Львове, потым вучыўся ў Кракаве па класе фартэпіяна ў А. Петэрса, паралельна займаўся музыкалогіяй у Ягелонскім універсітэце. Выкладаў у Познаньскай кансерваторыі тэорыю музыкі і кампазіцыі [7, с. 48–50].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

жыцця, творчасці і музычна-грамадскай дзейнасці Манюшкі, якія раней замоўчваліся ці наўмысна скажаліся.

З найбольш ранніх даследаванняў творчасці С. Манюшкі ў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца асобнікі польскіх аўтараў Здзіслава Яхімецкага [9] і Станіслава Невядомскага [12].

Здзіслаў Яхімецкі (1882–1953) – гісторык музыкі, кампазітар, прафесар Ягелонскага ўніверсітэта і Кракаўскай музычнай акадэміі [14, s. 265]. Яго манаграфія, прысвечаная С. Манюшку, была надрукавана ў Варшаве ў 1921 г. У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца два асобнікі гэтага выдання.

Караль Станіслаў Невядомскі (1857–1936) – польскі кампазітар, дырыжор, музычны крытык, педагог, вучань Ф. Шапэна. Працаваў у Львове ў якасці выкладчыка кансерваторыі Галічскага музычнага таварыства прафесарам тэорыі і гісторыі музыкі. Друкаваўся з крытычнымі артыкуламі ў львоўскіх і варшаўскіх перыядычных выданнях «Gazeta Lwowska», «Echo Muzyczne, Teatralne i Artystyczne», «Muzyka», «Warszawianka» і інш. З 1919 г. пражываў у Варшаве, там жа ён напісаў грунтоўнае даследаванне жыцця і дзейнасці Станіслава Манюшкі [15, s. 76–77]. Кніга выйшла ў 1928 г., выданне багата аздоблена ілюстрацыямі.

Трэба адзначыць выданы ў Пецярбургу (1900) накладам К. Грандышынскага біяграфічны нарыс Баляслава Вільчынскага, прысвечаны С. Манюшку [19]. Польскі музыказнаўца імкнуўся да найбольш поўнага, усебаковага асвятлення творчасці стваральніка польскай нацыянальнай класічнай оперы. У сваім нарысе аўтар распавядае пра поспех опер кампазітара: трагічнай «Галькі», камічнай «Сялянкі», лібрэта да якой напісаў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.

З дапамогай кнігі Эдварда Вроцкага магчыма перанесціся ў больш блізкі час, на выставу, прысвечаную Станіславу Манюшку, якая праходзіла ў Вільні ў 1932 г. Кніга-каталог «Wystawa Moniuszkowska w Wilnie» [20] знаёміць з экспанатамі выстаўкі. Гэта партрэты кампазітара, акварэльныя малюнкі з выявамі яго родных мясцін, пісьмы, тэатральныя афішы і іншыя цікавыя матэрыялы, што датычацца творчай дзейнасці музыканта. Каталог быў надрукаваны з нагоды 60-годдзя з дня смерці Станіслава Манюшкі.

Нельга пакінуць па-за ўвагай асобнікі XIX ст. «Encyklopedyja powszechna» (1864 [8, s. 791–797], 1878 [13, s. 41–42]), «Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich» (1892 [17, s. 732]), па якіх можна прасачыць жыццёвы шлях нашага славутага земляка, даведацца пра родныя мясціны Станіслава Манюшкі. У першай палове XIX ст. Манюшкі валодалі ў Мінскай губерні маёнткамі, якія некалі належалі князям Агінскім. Дзед кампазітара, суддзя Станіслаў Манюшка, у маладосці быў чалавекам бедным, але ж з цягам часу разбагацеў і зрабіўся гаспадаром самага вялікага маёнтка ў Літве. Яго дзеці – шасцёра сыноў і чатыры дачкі – атрымалі ў спадчыну вялікія фальваркі і значныя грашовыя сродкі. Бацька кампазітара, які быў даволі здольным мастаком і паэтам, непадалёку ад Мінска, ля Смілавіч, атрымаў


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by
у спадчыну фальварак Убель. У гэтым сціплым драўляным доміку каля рэчкі Волмы 5 мая 1819 г. нарадзіўся хлопчык, якому далі імя Станіслаў-Ян-Эдвард-Казімір.

Станіслаў Манюшка падараваў польскаму і беларускаму народам песні нацыянальныя, глыбока чуллівыя. Уладзіслаў Сыракомля напісаў верш-прысвячэнне кампазітару «Grajek wioskowy. Stanisławowi Moniuszce poświęcam», у якім падкрэсліў яго таленавітасць. Верш «Grajek wioskowy» («Вясковы музыка») быў надрукаваны ў паэтычным зборніку У. Сыракомлі «Gawęd, rymów ulotnych i przekladów» (1856) [18, s. 1]. У гэтым асобніку таксама надрукаваны другі верш-прысвячэнне Станіславу Манюшку – «Do Stanisława Moniuszki. (Kantata w dzień Imienin, do muzyki J. Z.)» [Тамсама, s. 73].

Творчая спадчына Станіслава Манюшкі належыць усяму чалавецтву. Але асабліва блізкая яна палякам і беларусам, таму што ў сваіх творах славуты кампазітар адлюстроўваў нацыянальны дух гэтых блізкіх народаў, гістарычны лёс і культура якіх маюць шмат агульнага.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Мальдзіс, А. Падарожжа ў XIX стагоддзе: з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры : навук.-папул. нарысы / А. Мальдзіс. – Мінск : Нар. асвета, 1969. – 206 с.

2. Манюшка, С. Песні з-над Нёмна і Дзвіны / С. Манюшка ; на тэксты Я. Чачота ; уклад. Г. Каржанеўская, У. Мархель, В. Скарабагатаў ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Мінск : Беларус. Капэла, 1996. – 55 с.

3. Мархель, У. Крыніцы памяці: Старонкі беларуска-польскага літаратурнага сумежжа / У. Мархель. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 222 с.

4. Мархель, У. І. «Сялянскія песенькі» ў «Хатнім спеўніку» / У. Мархель, В. Скарабагатаў. – Мінск : Ваўкалака-РАКАНОН ТМ, 1996. – 10, [1] с. : нот. іл.

5. Рудзинский, В. Монюшко / В. Рудзинский ; авториз. пер. с пол. Е. Бессоновой и Р. Кашер ; под ред. О. Левтоновой. – М. : Музгиз, 1960. – 284 с.

6. ЦНБ НАН Беларусі. АРКіР. – Ф. 31. Воп. 1. Адз. зах. № 918.

7. Шумская, І. М. Музыка ў кантэксце беларуска-польскага міжкультурнага ўзаемадзеяння / І. М. Шумская. – Мінск : Медысонт, 2011. – 160 с.

8. Encyklopedyja powszechna. – Warszawa : Orgelbrand, 1859–1868. – T. 18 : Maremmy – Mstow. – 1864. – 984 s.

9. Jachimecki, Z. Stanisław Moniuszko: 1819–1872 / Z. Jachimecki. – Warszawa [etc.] : Gebethner i Wolff, 1911. – XI, 295 s. : 1 portr.

10. Laskarys, J. Wspomnienie z dziedziny sztuk pięknych na Litwie w roku 1857 / J. Laskarys // Teka Wileńska / wyd. przez Jana ze Śliwina. – Wilno : Druk. Teofila Glücksberga, 1858. – № 4. – 444 s.

11. Moniuszko, S. Nad Nidą, słowa Wł. Wolskiego; Piosnki sielskie przez Wł. Syrokomli; Piesn wojta; Drugi śpiewnik domowy – Wyjazd z Ukrainy; Czwarty śpiewnik domowy – Dary; Z piątego śpiewnika domowego – Sierota i O matko moja; Magda Kaczmarka, ballada E. Sztyrmera / [nuty] / S. Moniuszko. – Wilno : Nakł. Jozefa Zawadzkiego, [b. r.]. – 41 s.

12. Niewiadomski, S. Stanisław Moniuszko / S. Niewiadomski. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1928. – 72 s. : il. – (Biblioteka muzyczna / pod red. M. Glińskiego).

13. Orgelbrand, S. Encyklopedyja powszechna / S. Orgelbrand. – Nowe ster. wyd. – Warszawa : Nakł., druk i własnosc S. Orgelbranda synow, 1877–1879. – T. 8 : Minasowicz – Pawlikowski. – 1878. – 480 s.

14. Polski słownik biograficzny / Pol. Akad. Nauk, Inst. Historii. – Wrocław [etc.] : Ossolineum [etc.], 1935–1993. – T. 10/2, z. 45 : Ilowski Stanislaw – Jagniatowski Wladysław. – Wrocław [etc.] : Ossolineum, 1963. – 320 s.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

15. Polski słownik biograficzny / Pol. Akad. Nauk, Inst. Historii. – Wrocław [etc.] : Ossolineum [etc.], 1935–1993. – T. 23/1, z. 96 : Niemirycz, Władysław – Nos, Aleksander. – Wrocław [etc.] : Wyd-wo PAN, 1978. – 208 s.
16. Rudziński, W. Stanisław Moniuszko: studia i materiały / W. Rudziński. Cz. 1. – Kraków : Pol. Wyd-wo Muz., 1955. – 477 s. : il. – (Studia i materiały do dziejów muzyki polskiej ; t. 1).
17. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich : w 15 t. / pod red. F. Sulimierskiego, B. Chlebowskiego, W. Walewskiego. – Warszawa : Nakł. F. Sulimierskiego i W. Walewskiego, 1880–1902. – T. 12. – 1892. – 960 s.
18. Syrokomla, W. Gawęd, rymów ulotnych i przekladów / W. Syrokomle. – Wilno : Józef Zawadzki, 1856. – T. 3. – 247 s. ; T. 4. – 176 s.
19. Wilczynski, B. Stanisław Moniuszko: dziedzictwo, życiorys i muzyka: zarys biogr. / B. Wilczyński. – Petersburg : Grendyszyński, 1900. – 163 s. : porr. – (Życiorysy sławnych polakow ; nr 16).
20. Wystawa Moniuszkowska w Wilnie / oprac. E. Wrocki. – Wilno : Lux, 1932. – 36 s.

**Т. В. Гинзбург**

*Российский национальный музей музыки*
*(Москва, Россия)*

# НАСЛЕДИЕ СТАНИСЛАВА МОНЮШКО В ФОНДАХ РОССИЙСКОГО НАЦИОНАЛЬНОГО МУЗЕЯ МУЗЫКИ. К ИСТОРИИ СОХРАНЕНИЯ И ПУБЛИКАЦИИ

Связи Станислава Монюшко (1819–1872) с русской культурой были разносторонними, а его музыкальное наследие стало неотъемлемой частью российской и советской культур.

Монюшко четыре раза (в 1842, 1849, 1856, 1870 гг.) приезжал в Петербург, где безуспешно пытался устроиться на службу, организовывал концерты из своих произведений, готовил публикации и издавал вокальные сочинения, ряд из которых были написаны на стихи русских поэтов (Н. В. Кукольника, В. Г. Бенедиктова, И. С. Никитина и др.). Деловые и дружеские связи соединяли Монюшко с деятелями русской культуры. Александр Даргомыжский стал его другом и «старшим братом», а Цезарь Кюи – учеником по теории музыки и композиции. Оперы Монюшко ставились в России в Императорских театрах и в оперных товариществах, на столичных и провинциальных сценах. Камерные сочинения композитора входили в репертуар выдающихся российских исполнителей. Музыка Монюшко еще при жизни была признана российскими коллегами, критиками и слушателями, и, как известно, образ композитора вошел в сонм выдающихся деятелей, запечатленных И. Е. Репиным на полотне «Славянские композиторы».

Материалы творческого наследия Монюшко собираются и хранятся в Российском национальном музее музыки на протяжении всей его истории – более 100 лет. Уже при открытии музея в 1912 г.[1] в его коллекции были представле-

[1] Музей был открыт в 1912 г. как Музей имени Н. Г. Рубинштейна в Московской консерватории.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by